# Больш за 6,2 тыс. шматдзетных сем’яў адкрылі рахункі па новай праграме “Сямейны капітал”




Усяго на 1 верасня для шматдзетных сем’яў адкрыта 88 285 дэпазітных рахункаў “Сямейны капітал”, з якіх па праграме 2020-2024 гадоў – 6 221, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Па праграме “Сямейны капітал” 2015-2019 гадоў для шматдзетных сем’яў адкрыта 82 064 дэпазітныя рахункі на суму $820,64 млн. Памер назначанай у мінулую пяцігодку сумы складаў $10 тыс. для шматдзетных сем’яў, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўлена, удачарона) у перыяд з 1 студзеня 2015 года па 31 снежня 2019 года ўключна. Звярнуцца па назначэнне сямейнага капіталу можна было па 30 чэрвеня 2020 года ўключна – не пазней за 6 месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга або наступных дзяцей.

Па праграме 2020-2024 гадоў для шматдзетных сем'яў адкрыта 6 221 дэпазітны рахунак на суму Br139,973 млн. У новай пяцігодцы памер сямейнага капіталу складае Br22,5 тыс. і назначаецца шматдзетным сем'ям, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўлена, удачарона) з 1 студзеня 2020 года па 31 снежня 2024 года ўключна.

"На 1 верасня 2020 года на датэрміновае распараджэнне сродкамі сямейнага капіталу пададзена 21 742 заявы. З іх на паляпшэнне жыллёвых умоў – 20 056 (92 працэнты), на атрыманне адукацыі – 936 (4,5 працэнта), на атрыманне медыцынскіх паслуг – 750 заяў (3,5 працэнта). Прынята 19 953 рашэнні аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу", – адзначылі ў Мінпрацы. Больш за ўсё рашэнняў аб размарозцы сямейнага капіталу прынята ў Брэсцкай вобласці – 4 539, следам ідуць Мінская вобласць – 3 186, Гомельская – 3 081, Мінск – 2 692, Гродзенская – 2 432, Магілёўская – 2 082. Менш за ўсё такіх рашэнняў прынята ў Віцебскай вобласці – 1 941.

БЕЛТА